Источник: "Народная газета" - 2017-10-06

# ЗНАЧНЫ ПРЫРОСТ

**Максім Осіпаў**
*osipov@sb.by*

Прагнозы наконт рэкорднага ўраджаю цалкам спраўдзіліся. У краіне намалочана 7 млн 664 тысячы тон збожжа — на 633 тысячы тон больш, чым у мінулым годзе. Ураджайнасць збожжавых і зернебабовых склала 35,6 ц / га. Гэты паказчык таксама перавысіў леташні — на 2,2 ц / га.

Не падвёў і рапс. У мінулым годзе было сабрана 260 тысяч тон масланасення, а ў цяперашнім — больш за 700 тысяч. Такія аб'ёмы дазволяць падрыхтаваць запасы на экспарт, а дзякуючы абноўленым зернесушыльным комплексам — мінімізаваць страты.

Начальнік галоўнага ўпраўлення раслінаводства Мінсельгасхарчу Андрэй Занеўскі распавёў, што зараз у краіне працягваецца ўборка бульбы, кукурузы на сілас, цукровых буракоў. Другі хлеб ужо ўбраны з больш як 71 працэнта плошчаў. Ураджайнасць узрасла да 315,1 ц / га — яна на 55 ц / га вышэй за леташнюю. Плануецца ўборку бульбы завяршыць у сярэдзіне наступнага тыдня, кукурузы на сілас — да канца тыдня, а цукровыя буракі сабраць да 1 лістапада.

Акрамя таго, у краіне ўжо ўбралі больш за палову плошчаў агародніны адкрытага грунту: капусты, буракоў сталовых, морквы, цыбулі, агароднінnага гарошку. Яе сабрана 55,9 тысячы тон, ураджайнасць — 313 ц / га (на 4 ц / га больш у параўнанні з адпаведным перыядам 2016 года). З улікам жа цяпліц усяго сабрана 173,4 тысячы тон агародніны (без бульбы), прычым 121,6 тысячы тон з іх ужо рэалізаваныя.

А вось нязначны на першы погляд, але надзвычай важны момант. На днях у нашай краіне ўпершыню пачалі выпускаць сурвэткі для каровінага вымя. Пробную партыю — 3 тысячы ўпаковак па 100 штук кожная — паставіла Антопальская ватна-прадзільная фабрыка. Такая вытворчасць вельмі важная для айчыннага аграсектара, бо без вільготных аднаразовых сурвэтак немагчыма атрымліваць малако класа "экстра".

## КАМЕНТАРЫЙ



**Аляксандр Шэпшэлеў,** старшыня аддзялення аграрных навук савета маладых вучоных НАН, намеснік генеральнага дырэктара НПЦ па харчаванні:

— Цяперашні ўраджай шмат у чым абавязаны выкананню тэхналогій, а таксама істотнай мадэрнізацыі аграпрамысловага комплексу і вялікаму ўкладу айчынных вучоных у сферу АПК. Не адстае і перапрацоўчая прамысловасць: нашы вытворцы імкнуцца захаваць высокую якасць прадуктаў. Акрамя таго, у нас адбыўся сапраўдны прарыў па такім кірунку як стварэнне функцыянальных прадуктаў харчавання. Гэта значыць, нашы прадукты ўжо не нясуць толькі функцыю папаўнення энергіі чалавека — яны пачынаюць "спецыялізавацца" па канкрэтных абласцях жыццядзейнасці людзей. Ствараецца спартыўнае харчаванне, харчаванне для людзей сталага ўзросту, розных узроставых груп дзяцей, цяжарных жанчын, кормячых маці. І ў гэтым таксама немалая заслуга вучоных.

Максім Осіпаў. Значны прырост